# НАРОДНАМУ ПАЭТУ РЭСПУБЛІКІ т. Я. Д. КУПАЛЕ

**Совет Народных Камісараў Беларускай ССР горача вітае Вас, т. КУПАЛА, з слаўным трыццацігадовым юбілеем Вашай яркай літаратурна-паэтычнай дзейнасці. Як вялікі майстар мастацкага слова беларускага народу, Вы сваімі творамі прыносіце вялікую карысць справе вялікай соцыялістычнай будоўлі. Вашы творы з'яўляюцца важным укладам у скарбніцу совецкай беларускай культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу. Асабліва павінны быць адзначаны Вашы апошнія паэмы і вершы («Над ракою Арэсай», «Барысаў», «Лётчык і хлопчык», «Нашаму сцяту», «Партызаны», «Сыны» і інш.) У гэтых творах адчуваецца Ваша другая маладосць, яны грунтуюцца на пазіцыях соцыялістычнага рэалізма, яны напоўнены юнацкай бадзёрасцю, узбуджаюць у шырокіх масах творчы энтузіязм і заклікаюць іх да новых перамог. Гэтыя творы сведчаць аб тым, што Вы, таленавіты народны пясняр, знайшлі сябе на шляху партыі Леніна—Сталіна, на шляху Саветаў, на які Вы сталі моцна абодвума нагамі і бок а бок з перадовым пролетарыятам ідзеце наперад да новых перамог. Гэта ёсць самы пэўны шлях для кожнага грамадскага, творчага работніка.**

**Я ўпэўнен, што Ваш нядзюжынны талент народнага пясняра—народнага паэта рэспублікі будзе поўнасцю, без рэшткі, аддан на карысць рабочых і калгаснікаў, на карысць нашай партыі і совецкай улады.**

**Жадаю Вам, дарагі т. КУПАЛА, яшчэ многа, многа гадоў жыць і працаваць. Моцна цісну Вашу руку.**

**Старшыня Совета Народных Камісараў БССР**

**Н. ГАЛАДЗЕД.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ